*Пролетары ўсіх краін, яднайцеся!*

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП (б) Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 59 (73) | Серада, 12 снежня 1945 г.

## ВЫКАНАЦЬ ГАДАВЫ ПЛАН НАРЫХТОЎКІ І ВЫВАЗКІ ЛЕСУ

Вялікая Айчынная вайна пабеданосна завершана. Наша краіна ўступіла ў перыяд мірнага развіцця. Совецкі ўрад, партыя Леніна—Сталіна робяць усе намаганні да таго, каб хутчэй ліквідаваць вынікі нямецкай акупацыі і забяспечыць далейшы рух уперад.

З першых-жа дзён мірнага жыцця совецкі народ заняты вялікай творчай працай. У раёнах, якія разрушаны нямецкімі акупантамі, бурліць вялікая праца па аднаўленню прадпрыемстваў, культурных і навуковых устаноў.

Аб'ём і размах аднаўленчых работ расце з кожным днём. І поспех будаўніцтва будзе залежыць ад таго, наколькі будзе ў дастатковай колькасці будаўнічых матэрыялаў. Адным з першачарговых будматэрыялаў з'яўляецца лес. Ён ідзе на будаўніцтва фабрык і заводаў, лес патрэбен Данбасу.

Наша рэспубліка ўступіла ў перыяд нарыхтовак і вывазкі лесу. Нашаму раёну ў чацвертым квартале 1945 года і першым квартале 1946 года патрэбна нарыхтаваць 19 тысяч кубаметраў і вывезці 18 тысяч. Зімовы сезон самы адказны і рашаючы ў справе нарыхтоўкі і вывазкі лесу. Але трэба сказаць, што ў нашым раёне лесанарыхтоўчыя работы праходзяць пакуль што нездавальняюча. Чацверты квартал на зыходзе, але план па нарыхтоўцы і вывазцы не выкананы.

Час не чакае. Лес патрэбен краіне. У нас ёсць усе магчымасці датэрмінова выканаць гадавы план нарыхтоўкі і вывазкі лесу. Трэба толькі зараз-жа ўсю ўвагу ўдзяліць гэтай адказнейшай задачы. Сельскім советам патрэбна выслаць у лес дастатковую колькасць лесарубаў і возчыкаў. Партыйным і комсамольскім арганізацыям, усяму актыву трэба правесці сярод сялян шырокую масава-палітычную работу, накіраваць усе намаганні вёскі на хутчэйшае выкананне гадавога плана лесанарыхтоўчых работ.

## Трэці ўрачысты пленум РК ЛКСМБ

9 снежня адбыўся III урачысты пленум райкома комсамола, прысвечаны ўручэнню раённай комсамольскай арганізацыі Чырвонага сцяга.

На пленуме прадстаўнік ЦК ВЛКСМ тав. Алісевіч выступіў з прывітальнай прамовай, затым уручыў Чырвоны сцяг сакратару РК ЛКСМБ тав. Балдыкаву, які выступіў з адказным словам.

Выступаўшыя комсамольцы т. т. В. Самовіч, І. Дзеркач запэўнілі партыю і ЦК ВЛКСМ, што раённая комсамольская арганізацыя аддасць усе сілы, каб быць дастойнай уручанага Чырвонага сцяга.

Ад імені раённай партыйнай арганізацыі комсамольцаў вітаў сакратар РК КП(б)Б тав. Дроцкі.

## Зацверджанне акруговых выбарчых камісій па выбарах у Совет Нацыянальнасцей ад Беларускай ССР

На падставе арт. арт. 47, 48 і 49 „Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР" Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР ад 29 лістапада г. г. зацверджана 25 акруговых выбарчых камісій па выбарах у Совет Нацыянальнасцей ад Беларускай ССР.

У тым ліку:

**КОБРЫНСКАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ ПА ВЫБАРАХ У СОВЕТ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ ВЫБАРЧАЯ АКРУГА № 59**

Старшыня выбарчай камісіі **Лукіна** Ефрасіня Пятроўна—ад комуністычнай арганізацыі Кобрынскага раёна;

Намеснік старшыні выбарчай камісіі **Шунько** Тарас Андрэевіч—ад комуністычнай арганізацыі Антопальскага раёна;

Сакратар выбарчай камісіі **Лебедзеў** Нікалай Іванавіч—ад Кобрынскай раённай арганізацыі Ленінскага Комуністычнага саюза моладзі Беларусі.

**Члены выбарчай камісіі:**

**Карпушэвіч** Пётр Францавіч—ад сялян Ружанскага пасялковага совета,

**Шаўчук** Нікалай Панцелеевіч—ад прафесіянальнага саюза работнікаў пачатковых і сярэдніх школ Беразоўскага раёна,

**Бадунова** Людміла Нікалаеўна—ад рабочых і служачых чыгуначнай станцыі Івацэвічы,

**Ерашкіна** Софія Нікалаеўна—ад рабочых і служачых Ружанскага райпромкамбіната,

**Сілівончык** Васілій Алісеевіч—ад сялян вёскі Броды, Антопальскага раёна,

**Скаўронскі** Міхаіл Алісеевіч,

**Самок** Валерый Іосіфавіч—ад рабочых і служачых Пружанскага райпромкамбіната,

**Пытляк** Васілій Кірылавіч—ад рабочых і служачых Косаўскага леспрамгаса.

# РАШЭННЕ

## ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БРЭСЦКАГА АБЛАСНОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

## Аб зацверджанні састава Акруговай выбарчай камісіі Кобрынскай выбарчай акругі № 520 па выбарах у Совет Саюза

На падставе арт. арт. 43, 44, 45 „Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР“ Выканаўчы Камітэт Абласнога Совета дэпутатаў працоўных рашыў зацвердзіць Акруговую выбарчую камісію Кобрынскай выбарчай акругі № 520 па выбарах у Совет Саюза ў саставе наступных прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных:

Старшыня Акруговай выбарчай камісіі **Макушэнка** Іван Пятровіч—ад камуністычнай арганізацыі Кобрынскага раёна.

Намеснік старшыні Акруговай выбарчай камісіі **Лукашук** Марфа Наумаўна—ад рабочых і служачых чыгуначнай станцыі Кобрын.

Сакратар Акруговай выбарчай камісіі—**Казлоў** Грыгорый Варфаламеевіч—ад прафесіянальнага Саюза работнікаў дзяржаўнай установы Кобрынскага раёна.

Члены Акруговай выбарчай камісіі: **Несцяровіч** Міхаіл Аляксеевіч—ад сялян вёскі Хорава, Пружанскага раёна;

**Казлоўская** Марыя Іванаўна—ад прафесіянальнага саюза работнікаў пачатковых і сярэдніх школ Пружанскага раёна;

**Колас** Сямён Васільевіч—ад сялян вёскі Ціхны Беразоўскага раёна;

**Басько** Вера Міхайлаўна—ад сялян Палонскага сельсовета, Ружанскага раёна;

**Суша** Міхаіл Грыгор'евіч—ад рабочых і служачых райпромкамбіната Пружанскага раёна;

**Паўлючык** Еўдакія Несцераўна—ад камуністычнага саюза моладзі Дывінскага раёна;

**Карпышкова** Александра Емельянаўна—ад прафесіянальнай арганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ Касаўскага раёна.

**В. а. Старшыні выканкома Брэсцкага аблсовета дэпутатаў працоўных РАЙ.**
**Сакратар выканкома Брэсцкага аблсовета дэпутатаў працоўных БЕЛЯЦКІ.**

## Выбарчыя акругі і выбарчыя ўчасткі

Выбары дэпутатаў у Вярхоўны Совет СССР згодна артыкулаў 34 і 35 Канстытуцыі СССР праводзяцца грамадзянамі Савецкага Саюза па выбарчых акругах.

Выбарчыя акругі па выбарах у Совет Саюза створаны па ўсёй тэрыторыі Савецкага Саюза з разліку: адна выбарчая акруга на 300 тысяч насельніцтва.

Выбарчыя акругі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей створаны ў саюзных і аўтаномных рэспубліках, аўтаномных абласцях і нацыянальных акругах.

Ад кожнай выбарчай акругі як па выбарах у Совет Саюза, так і па выбарах у Совет Нацыянальнасцей выбіраецца па аднаму дэпутату.

У многіх капіталістычных краінах выбарчыя акругі ствараюцца не ад колькасці насельніцтва, а па велічыні тэрыторыі. У рэзультаце такой сістэмы раёны, населеныя багатымі класамі, пасылаюць дэпутата ў парламент ад 5—6 тысяч выбаршчыкаў, а густа населеныя рабочыя раёны—ад 100—150 тысяч выбаршчыкаў. Ні аб якіх роўных выбарах пры такой сістэме гаварыць не проходзіцца.

Толькі Сталінская Канстытуцыя і савецкая выбарчая сістэма забяспечваюць для ўсіх грамадзян поўную роўнасць выбараў.

Для прыёма выбарчых бюлетэней і падліку галасоў выбаршчыкаў тэрыторыя кожнай выбарчай акругі дзеліцца на выбарчыя ўчасткі. Выбарчыя ўчасткі на выбарах у абедзве палаты— у Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцей з'яўляюцца агульнымі.

Стварэнне выбарчых участкаў праводзіцца гарадскімі і раённымі советамі дэпутатаў працоўных з разліку—адзін выбарчы ўчастак на 1500—3000 чалавек насельніцтва. У Беларускай ССР выбарчыя ўчасткі ствараюцца як правіла па сельсоветам: тэрыторыя сельсовета, налічваючая не больш двух тысяч чалавек, складае адзін выбарчы ўчастак.

У выключных выпадках выбарчы ўчастак можа быць створан у пунктах з насельніцтвам ад 300 да 500 чалавек, калі гэты населены пункт размешчан на адлегласці больш 10 кіламетраў ад цэнтра бліжэйшага выбарчага ўчастка.

У воінскіх часцях і злучэннях ствараюцца асобныя выбарчыя ўчасткі з колькасцю ад 50 да трох тысяч выбаршчыкаў. Выбарчыя ўчасткі ствараюцца таксама ў бальніцах, радзільных дамах, санаторыях, дамах інвалідаў і пасажырскіх паяздах. Усе гэтыя выбарчыя ўчасткі ўваходзяць у тую выбарчую акругу, на тэрыторыі якой знаходзяцца ў дзень выбараў.

Наш выбарчы закон поўнасцю забяспечвае і стварае для кожнага выбаршчыка ўмовы для асабовага ўдзелу ў галасаванні.

**І. Крыскавец.**

* * *

У нашым раёне створана 22 выбарчых участкі. Сельскія советы павінны зараз-жа прыступіць да абарудавання памяшканняў выбарчых участкаў. Памяшканні выбарчых участкаў трэба ўкрасіць і падрыхтаваць спецыяльныя комнаты для галасавання.

## НАРАДА ПАРТЫЙНА-СОВЕЦКІХ РАБОТНІКАЎ

10 снежня ў райкоме КП (б) Б адбылася нарада партыйна-совецкіх работнікаў.

З дакладам аб падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет СССР выступіў сакратар РК КП (б) Б тав. Турчынскі.

Дакладчык асобую ўвагу звярнуў на падрыхтоўку да выбараў, разгортванне масава-палітычнай работы сярод насельніцтва.

У спрэчках выступалі кіраўнікі агіткалектываў, агітбрыгад, абмяняўшыся вопытам работы.

На нарадзе таксама было [illegible]разана пытанне [illegible] падрыхтоўкі [illegible]



П[illegible]АУ

ГЛ 14881 Адрас рэдакцыі: г. Антопаль, Совецкая вуліца, дом № 1.

